## Дыпламатыя БССР: некаторыя аспекты сучаснага асэнсавання

**Коршак М.А.**, *Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна*
**Стралец М.В.**, *Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт*

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка праіснавала з 1 студзеня 1919 г. да 19 верасня 1991 г. Пры разглядзе пытання аб яе міжнароднай правасуб'ектнасці трэба пастаянна мець на ўвазе кардынальныя адрозненні паміж яе фармальным статусам і рэальнымі паўнамоцтвамі ў галіне знешняй палітыкі. Фактычна вышэйшую прыступку ва ўладнай структуры БССР займала кіраўніцтва Камуністычнай партыі Беларусі, якая спачатку па правах секцыі ўваходзіла ў склад Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў), затым мела статус адной з рэспубліканскіх арганізацый РКП(б), УКП(б), КПСС. Лідэры БССР дзейнічалі ў жорсткіх рамках, зададзеных афіцыйнай Масквой і таму можна толькі ўмоўна весці размову аб яе рэальнай знешняй палітыцы. Уяўляецца слушным прасочваць удзел БССР у ажыццяўленні курса Савецкай Расіі, СССР у міжнародных справах. Маштабы дадзенага ўдзелу з 1919 па 1991 гг. адрозніваліся арытмічнасцю, уздымамі і спадамі, што вызначалася фактарамі прававога, знешнепалітычнага і г.д. парадку. Для адлюстравання гэтых момантаў мэтазгодна паказаць спецыфіку кажнага з этапаў гісторыі замежных сувязяў БССР.

Храналагічныя рамкі першага этапу – 1 студзеня 1919 г. – ліпень 1923 г. Калі абмяжоўвацца чыста фармальным бокам, можна канстатаваць, што на гэтым этапе адбылося станаўленне БССР у якасці суб'екта міжнародных адносін і міжнароднага права, што яна была прызнана і дэ-юрэ, і дэ-факта. Расійскі , германскі, польскі вектары яе замежных сувязяў былі падмацаваны фактам наяўнасці адпаведных дыпламатычных стасункаў. У Старым Свеце былі і дзяржавы, якія, з аднаго боку, не падтрымлівалі з БССР стасункаў на такім ўзроўні, а з другога боку, не выключалі яе з ліку патэнцыяльных партнёраў для вядзення міжнародных перамоў, распрацоўкі міжнародных пагадненняў. Такая пазіцыя была характэрна для афіцыйных Каунаса, Таліна, Рыгі, Вены, Прагі, Анкары, Рыма, Лондана. Аўтографы беларускіх прадстаўнікоў былі пакінуты на 12 дамовах, пагадненнях, датаваных 1921 і 1922 гг. Дыпламатыя БССР мела дачыненне да Маскоўскай канферэнцыі па раззбраенню (снежань 1922 г.), генуэзскай канферэнцыі (красавік 1922 г.). Да ўтварэння Літоўска-Беларускай ССР і пасля яе знікнення існаваў Народны камісарыят замежных спраў (НКЗС) БССР.

Аднак фактычна вызначальныя з пункту гледжання інтарэсаў Беларусі рашэнні прымала Масква. Аб гэтым сведчылі ўваходжанне Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерній у склад РСФСР (1919-1920 гг.), ленінска-сталінскі эксперымент з Літоўска-Беларускай ССР (1919-1920 гг.)

расійска-літоўская дамова ад 12 ліпеня 1920 г., рыжская мірная дамова ад 18 сакавіка 1921 г.

30 снежня 1922 г. быў утвораны СССР, у ліпені 1923 г. скасоўваецца НКЗС БССР, што прадвызначыла пачатак другога этапа знешніх сувязяў БССР, які меў наступныя храналагічныя рамкі (ліпень 1923 г. – люты 1944 г.). Гэты этап не дае падстаў весці гаворку нават пра фармальную міжнародна-прававую суб'ектнасць БССР. Аб гэтым сведчылі агульнасаюзныя Асноўныя законы, датаваныя 1924, 1936 гг., распрацаваныя на іх грунце Асноўныя законы БССР 1927, 1937 гг. У рэспубліцы не існавала ўнутрыбеларускіх структур, адказных за замежныя сувязі. Да такіх структур нельга адносіць Упраўленне ўпаўнаважанага НКЗС пры СНК БССР, якое вядома з 1923 г. Ужо з самога наймення дадзенага ўпраўлення вынікала, што гэта – структурнае падраздзяленне не беларускага, а агульнасаюзнага наркамата. Аб'ём працы ва ўпраўленні быў намнога меншы, чым у НКЗС БССР. Для гісторыкаў уяўляе нейкую цікавасць толькі першапачатковы перыяд яго існавання, які займае менш 10 гадоў. Затым гэта структура аніяк не напаўняла канкрэтным зместам сваё функцыянальнае прызначэнне.

У плане развіцця знешнепалітычных сувязяў БССР з замежнымі краінамі аналізуемы этап можна падзяліць на два падэтапы:

I. 1923 г. – канец 1920-ых гг.;

II. канец 1920-ых гг. – 1944 г.

На першым падэтапе ў адрозненні ад другога можна адзначыць нейкія адпаведныя здабыткі. Безвыніковасць другога падэтапа тлумачыцца негатыўнымі наступствамі кардынальных змен, якія адбываліся ў палітыцы агульнасаюзнага кіраўніцтва напрыканцы 1920-ых гадоў.

Храналагічныя рамкі трэцяга этапа: 1 лютага 1944 г.– 1991 г. Гэты этап пачынаецца з таго, што Масква дае саюзным рэспублікам права на стварэнне ўласных наркаматаў замежных спраў, заключэнне міжнародных дамоў, уступленне ў міжнародныя арганізацыі. Адпаведныя змены былі ўнесены ў Канстытуцыі СССР 1936 г. і БССР 1937 г. Гэта права зноў атрымала канстытуцыйны ранг у Асноўных законах СССР 1977 г. і БССР 1978 г.

3 сакавіка 1944 г. зноў запрацаваў Народны камісарыят замежных спраў БССР, які праз 2 гады будзе перайменаваны ў Міністэрства замежных спраў БССР. Рэспубліка стала членам ААН, іншых арганізацый такога кшталту. З цягам часу набыло рэальныя абрысы пастаяннае прадстаўніцтва БССР пры ААН (1958 г.). Калі рэспубліка падыходзіла да фініша сваёй гісторыі, аўтографы яе прадстаўнікоў стаялі на 160 дамовах, канвенцыях, пагадненнях, якія мелі непасрэднае дачыненне да сферы міжнароднага права. Сталі рабіцца больш актыўныя крокі ў накірунку народнай дыпламатыі. З усіх падсістэм у міжнародным супольніцтве для БССР адназначна прыярытэтным быў сацыялістычны лагер, з дзяржавамі

якога развівалася ўсебаковае супрацоўніцтва. У выніку падпісання канкрэтных дамоў у якасці партнёраў рэспублікі выступалі буйныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі Польскай Народнай Рэспублікі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Народнай Рэспублікі Балгарыі, Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Усходнееўрапейскі вектар знешніх сувязяў БССР падмацоўваўся фактам існавання генеральных консульстваў некаторых краін у Мінску. З 1972 г. тут функцыянавалі адпаведныя ўстановы ГДР і ПНР, з 1990 г. – Балгарыі. Былі таксама пэўныя набыткі і ў працэсе ўдзелу БССР у развіцці знешнепалітычнага супрацоўніцтва СССР з несацыялістычнай часткай свету.

Разам з тым БССР і на гэтым этапе не стала рэальным суб'ектам міжнародных адносін і міжнароднага права. Яна па-ранейшаму была амаль поўнасцю падкантрольнай Палітбюро ЦК КПСС і МЗС СССР удзельніцай працэса рэалізацыі карэнных прынцыпаў агульнасаюзнай знешняй палітыкі.

Такія некаторыя аспекты сучаснага асэнсавання дыпламатыі БССР.

## Знешняя культурная палітыка Рэспублікі Беларусь

**Крывашэй Д.А.**, *Інстытут гісторыі НАНБ*

Знешняя культурная палітыка з'яўляецца адным з напрамкаў рэалізацыі задач знешнепалітычнай стратэгіі Рэспублікі Беларусь, накіраванай на забеспячэнне спрыяльных знешніх умоў для развіцця краіны, фарміравання яе станоўчага вобразу, папулярызацыі ведаў і пошуку новых шляхоў для дзейснага супрацоўніцтва, умацаванню міжнародных пазіцый краіны і яе міжнароднага аўтарытэта.

У лістападзе 2005 г. быў прыняты закон "Аб зацвярджэнні Асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь". Адной са сфер рэалізацыі знешняй палітыкі законам вызначана міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне культуры. Сярод асноўных задач знешняй палітыкі закон называе раўнапраўную інтэграцыю ў сусветную культурную прастору, стварэнне спрыяльных знешнепалітычных і знешнеэканамічных умоў для павышэння інтэлектуальнага і духоўнага патэнцыялу дзяржавы, фарміраванне добрасуседскіх адносін з суменнымі дзяржавамі, садзейнічанне рэалізацыі нацыянальных і культурных інтарэсаў этнічных беларусаў, якія пражываюць за межамі рэспублікі, прыцягненне знешніх інтэлектуальных і навуковых рэсурсаў ў мэтах культурнага развіцця Беларусі.

Як можна заўважыць, закон не згадвае аб "шматвектарнасці" знешняй палітыкі. У галіне культурнага супрацоўніцтва яскрава прасочваюцца асноўныя напрамкі: краіны – суседзі і падтрымка беларускай дыяспары. Акрамя гэтага закон звяртае ўвагу на важнасць культурнага аспекту ў развіцці трансгранічнага супрацоўніцтва.